Community-led Urban Strategies in Historic Towns (COMUS)

Funded by the European Union and the Council of Europe

EUROPEAN UNION

COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE

Implemented by the Council of Europe

**Урбаністычныя стратэгіі гістарычных гарадоў, арыентаваныя на супольнасці** (COMUS)”

**Папярэдняя тэхнічная ацэнка**

# Рэстаўрацыя Кармяліцкага касцёла і ўнікальных фрэсак 17 ст., добраўпарадкаванне тэрыторыі

**Мсціслаў**

**Рэспубліка Беларусь**

**Сакавік** 2017

OVPM
OWHC
OCPM

## 1. Уводзіны

### Кармяліцкі касцёл





*Размяшчэнне ў гістарычным цэнтры Мсціслава*




*Размяшчэнне на месцы*

1.1 Краіна ці тэрыторыя:  **Рэспубліка Беларусь**

1.2 Назва арганізацыі, якая сабрала інфармацыю: **Мсціслаўскі раённы выканаўчы камітэт**

1.3  Кантактныя асобы: **Наталля Біскуп, Людміла Кірыенка**

1.4 Email address: okinchits.mst@tut.by, irmaultra@yandex.by

1.5 Назва і адрас аб'екта: Касцёл кармелітаў, адрас: г. Мсціслаў, Магілёўская вобл, вул. Кірава. 4

1.6 Шыфр у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь:  511Г000504

1.7 Тып аб'екта: помнік  архітэктуры міжнароднага значэння

1.8 Асноўныя даныя: Касцёл уяўляе сабой каменную трохнефную базіліку  з двувежавым фасадам і пяціграннай абсідай. Ля касцёла знаходзіцца мураваная брама. Пабудаваны ў першай палове 17 ст. у стылі барока. Перабудаваны ў 1746 – 1750 гг. у стылі "віленскага барока" архітэктарам Ф. Глаўбіцам.

1.9 Сучаснае выкарыстанне: па-ранейшаму выконвае сакральную функцыю

## 1. Кароткае апісанне аб'екта і яго кіравання

Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці з'яўляецца адным з выбітных  помнікаў горада і ўнесены ў Дзяржаўны  спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь як помнік міжнароднага значэння. Пабудаваны ў 1614 ці 1617 г. спачатку як драўляны будынак, а ў 1637 г. як каменны. Значная перабудова касцёла адбылася ў 1746–1750 гг. архітэктарам Я. Глаўбіцам  у стылі так званага «віленскага» барока. Інтэр'ер будынку быў упрыгожаны ляпнымі алтарамі і фрэскамі ў стылі позняга барока. Фрэскі размешчаны на сценах галоўнага і часткі бакавых нэфаў. Захавалася каля 20 фрэскавых кампазіцый, з якіх найбольшую каштоўнасць маюць партрэты заснавальнікаў касцёла і батальныя сюжэты вайны з Маскоўскім царствам  1654-1667гг. Апошняя служба ў касцёле адбылася ў 1938 г. У савецкі перыяд у будынку касцёла знаходзілася сховішча гародніны. З 1974 па 1982 гг. і ў 1990 – 1994 гг.  у касцёле праводзіліся даследчыя, кансервацыйныя і рэстаўрацыйныя работы пад кіраўніцтвам архітэктара Я. Ханінай і мастака-рэстаўратара Ю. Маліноўскага. Быў зроблены праект рэстаўрацыі будынка і фрэсак, адрэстаўраваны перакрыцці, зашклёныя вокны, адноўлена ляпніна алтарнай чаткі, праведзена кансервацыя і ўмацаванне фрэсак. У капліцы, якая размешчана ў адным з бакавых нэфаў, быў адрэстаўраваны столь, умацаваны сцены, праведзена даследаванне,  кансервацыя і рэстаўрацыя жывапісу.

У 1991 г. касцёл аднавіў сваю дзейнасць як каталіцкі храм. Служба праводзіцца  толькі ў адрэстаўраванай частцы, у капліцы, Асноўная частка касцёла  закрыта для наведвання. Акрамя сакральнай, касцёл выконвае рэпрэзентатыўную функцыю ў гарадскім ландшафце. Ён з'яўляецца важнай архітэктурнай дамінантай і аб'ектам, які часта наведваецца турыстамі.

На сённяшні дзень будынак касцёла не мае вызначанага ўласніка, аднак, за яго стан і далейшыя работы па кансервацыі і рэстаўрацыі, згодна нацыянальнага заканадаўства, адказваюць як рэспубліканскія, так і мясцовыя ўлады.

## 3. Адміністратыўная інфармацыя

3.1 **Адказныя ўлады**

- Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
- Мсціслаўскі раённы выканаўчы камітэт
- Мсціслаўскі дэканат Мінска-Магілёўскай дыятэзіі

3.2 **Будынак, назва і адрас**

Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці

Мсціслаў, Магілёўскай вобл., вул. Кірава, 4

3.3 Map reference

Размяшчэнне ў прасторы X, Y каардынаты:
Spatial reference X, Y coordinates: 54.02378, 31.726114

3.4 **Тып помніка**

Помнік архітэктуры міжнароднага значэння

3.5 **Форма ўласнасці**

Уласнік не вызначаны. Зямля каля касцёла перададзена мясцовай каталіцкай абшчыне.

3.6 **Установленая заканадаўствам абарона/Абмежаванні**

Любое ўмяшанне на а'бекце адбываецца ў адпаведнасці з вызначанымі заканадаўствам патрабаваннямі і абмежаваннямі, якія дачыцца захавання гісторыка-культурнай каштооўнасці першай катэгорыі.

Касцёл Кармелітаў размешчаны ў гістарычным цэнтры горада Мсціслава. Любая праца па будаўніцтве, мадэрнізацыі, рэстаўрацыі і рамонту павінна ажыццяўляцца на падставе праекта зон аховы гістарычнага цэнтра, які распрацаваны ў рамках дэталёвага праекта рэгенерацыі цэнтральнай часткі горада Мсціслава (Праект 40.08-00.ГМ-10, УП "БЕЛНІІГОРАДАБУДАЎНІЦТВА").

Праект рэстаўрацыі і добраўпарадкавання аб'екта, згодна заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, павінен быць узгоднены з дзяржаўнымі органамі, адказнымі за ахову спадчыны. Для помнікаў 1-й катэгорыі такім органам з'яўляецца Міністэрства культуры.

На тэрыторыі дадзенай гісторыка-культурнай каштоўнасці, у ахоўнай зоне і зоне рэгулявання забудовы, неабходна забяспечыць:

- кансервацыю і аднаўленне гістарычна і культурна значных будынкаў і збудаванняў;
- захаванне гістарычна абумоўленай планіровачнай структуры і абрысаў помніка;
- аднаўленне страчаных элементаў вулічнай сеткі ў межах ахоўных зон, або аднаўленне прыроды планіровачнай структуры – у зоне рэгулявання забудовы;
- рэканструкцыю цалкам разбураных выбітных помнікаў архітэктуры і звычайных гістарычных будынкаў, або захаванне частак сцен і падмуркаў, якія захаваліся ў культурным пласце з арганізацыяй добраўпарадкавання тэрыторыі;
- кансервацыю, рэстаўрацыю і рэканструкцыю гістарычнага ландшафту і малых архітэктурных формаў;
- абмежаванне новага будаўніцтва ў зонах ахоўваемага ландшафту і рэгулявання забудовы;
- ачыстку тэрыторыі ад не капітальных мала каштоўных будынкаў з прадстаўленнем традыцыйных умоў для ўспрымання гістарычнага развіцця.

Такім чынам, забараняецца:

- размяшчэнне новых будынкаў без ўзгаднення з дзяржаўным органам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны –па месцы знаходжання помніка і ў ахоўнай зоне;
- будаўніцтва інжынерных і іншых збудаванняў, якія не адпавядаюць вонкаваму выгляду гістарычнага асяроддзя;
- вытворчасць земляных і будаўнічых работ, за выключэннем надзвычайных сітуацый, іншых відаў эканамічнай дзейнасці, без дазволу дзяржаўных органаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны - у межах помніка і ахоўнай зоны.

Любая дзейнасць, якая можа паставіць пад пагрозу цэласнасць будынкаў, згодна беларускага заканадаўства, павінна быць скаардынаваная з дзяржаўнымі органамі па ахове помнікаў, з органамі мясцовага кіравання і навуковым кіраўніком, прызначаным Міністэрствам культуры.

## 4. Агляд стану аб’екта

| Nr. | Адрас | Кароткае апісанне фізічнага стану (ад вельмі дрэннаг ада добрага) | Стан ацэнкі рызыкі | Прыярытэт для ўмяшання - высокі / сярэдні / нізкі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Вул. Кірава, 4<br>Мсціслаў 213453, Беларусь | Ня вельмі добры (у 1980-1990 гг. была праведзена кансервацыя будынку і фрэсак) | F | Сярэдні |

## 5. Існуючая інфармацыя

5.1 **Дакументальныя крыніцы**:

Помнік узгадваецца ў большасці гістарычных даследаванняў аб беларускай архітэктуры і гісторыі горада Мсціслава. Пры падрыхтоўцы гэтага дакладу былі праведзены кансультацыі з адпаведнымі экспертамі: архітэктарамі, гісторыкамі архітэктуры, юрыстамі. Былі выкарыстаныя архіўныя планы, гістарычныя даследаванні, публікацыі, у тым ліку інтэрнэт-выданні.



*Мсціслаў. Кармяліцкі касцёл Успення Божай Маці*



*Мсціслаў. Кармяліцкі касцёл Успення Божай Маці. План*



*Мсціслаў. Гравюра сярэдзіны 19-га стагоддзя.*

5.2 **Бібліяграфія**:


- Габрусь Т. В. «Мураваныя харалы: сакральная архітэктура беларускага барока». Мінск, «Ураджай», 2001 год. ISBN 985-04-0499-X.
- Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн.: БСЭ, 1986, 408 с., іл.
- Краснянский В.Г. Город Мстиславль (Могилевская губерния). – Вильно, 1912.
- А. М. Кулагін. Каталіцкія храмы Беларусі. — Мінск: 2008. ISBN 978-985-11-0395-5
- «Мстиславль, монастырь кармелитов» //Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік". Мінск, «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 1993 год. ISBN 5-85700-078-

Нарматыўныя акты:
Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, 20.07.2016, № 413 –3.
Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні праекта зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, размешчаных на тэрыторыі г. Мсціслава.

Інтэрнэт:
https://mstislavl.info/photogallery/mesta/92-karmelitskiy-kostel-v-mstislavle.html
https://mstislavl.info/point-of-interest/church/375-karmelitskiy-kostel-uspeniya-bozhey-materi.html
https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A6%D0%B5%D1%80%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D1%8C_%D0%92%D0%BE%D0%B7%D0%BD%D0%B5%D1%81%D0%B5%D0%BD%D0%B8%D1%8F_%D0%94%D0%B5%D0%B2%D1%8B_%D0%9C%D0%B0%D1%80%D0%B8%D0%B8_(%D0%9C%D1%81%D1%82%D0%B8%D1%81%D0%BB%D0%B0%D0%B2%D0%BB%D1%8C)
https://www.votpusk.ru/country/dostoprim_info.asp?ID=12762

5.3 **Праведзеныя палявыя даследаванні:**

Праводзіліся ў канцы 1970 – напачатку 1980-х гг. , 1990-гады. Архітэктурныя даследаванні і даследаванні жывапісу ў поўным аб'еме складаюць 6 тамоў.

5.4 **Праекты ў рабоце:**
Няма

5.5 **Праекты, якія плануюцца:**
Няма

5.6 **Фінансавыя разлікі:**
Не праводзіліся

## 6. Напаўненне ПТА

6.1 **Ступень/Характар ацэнкі**:

ПТА было распрацавана групай мясцовых экспертаў з далучэннем прафесіяналаў з нацыянальнай групы стэйкхолдэраў. Сярод іх:

- спецыяліст у галіне спадчыны, музейны работнік, які добра ведае гісторыю і культуру горада, адказны за ацэнку аб'ектаў спадчыны і распрацоўку канцэпцыі рэабілітацыі помніка;
- прадстаўнік мясцовай гарадской адміністрацыі, адказны за ацэнку прыбытковасці, інвестыцыйнай прывабнасці аб'екта; папярэднюю ацэнку выдаткаў на аднаўленне
- архітэктар, адказны за ацэнку фізічнага стану помніка і распрацоўку філасофіі кансервацыі.

Да распрацоўкі ПТА прыцягваюцца таксама: архітэктар, нацыянальны эксперт, які курыруе працу па распрацоўцы стратэгіі Мсціслава, спецыяліст у галіне інтэграцыйнай кансервацыі, архітэктар, былы навуковвы кіраўнік праекта рэстаўрацыі Карямліцкага касцёла ў 1994 г.
На канчатковым этапе ПТА будзе прааналізаваны экспертамі Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным каардынатарам, пасля чаго будуць праведзены кансультацыі з міжнародным вядучым экспертам праекта COMUS.
Куратарам працэсу распрацоўкі ПТА, які адсочвае ўсе этапы работ і іх якасць, з'яўляецца Супрацоўнік праекта COMUS. Чаканая працягласць падрыхтоўкі складае два месяцы.

6.2 **Абмежаванні даследавання**:

- Недахоп архіўнай інфармацыі (інфармацыі аб фрэсках, дакументацыя,звязаная з архітэктарам Глаўбіцам, г.д.)
- Адсутнасць кваліфікаванай рэстаўрацыі і экспертызы (недахоп спецыялістаў у экспертызы фрэсак)
- Адсутнасць дакументальна пацверджанай інфармацыі аб размяшчэнні і эвалюцыі ў часе і прасторы будынкаў былога Кармяліцкага манастыру.
- Неабходнасць у дадатковых археалагічных і мастацтвазнаўчых даследаваннях.
- Няма дакладна вызначанага бюджэту неабходных затрат на кансервацыю і рэстаўрацыю будынку.

## 7. ПТА

### 7.1 **Перадумовы**: **Форма**, **Функцыя і Эвалюцыя**

*7.1.1 Кароткае апісанне будынку з каментарыямі ў выпадку нгеабходнасці аб яго гарадскім кантэксце*

Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці – адзіны будынак, які захаваўся з былога Успенскага кляштару кармелітаў. Пабудаваны ў першай палове 17 ст. на месцы драўлянага храма. Быў перабудаваны ў 1746 –1750 гг. архітэктарам І. Глаўбіцам. Помнік архітэктуры барока і ракако.

Мураваная трохнефная шасціслуповая базіліка з двухвежавым фасадам і пяціграннай апсідай. Галоўны фасад фланкіраваны вежамі з паўсферычнымі купаламі і завершаны фігурным шчытом паміж імі. Сцены (таўшчыня дасягае 1,5 м) атынкаваныя і аздобленыя пілястрамі, карнізамі, прафіляванымі цягамі, прарэзаны лучковымі аконнымі праёмамі. У інтэр'еры – хоры пры ўваходзе, амвон, цэнтральны і бакавыя алтары, фрэскавы роспіс, ляпніна ў стылі ракако. Зберагліся каля 20 кампазіцый, у тым ліку на гістарычныя тэмы.

Каля касцёла пабудаваная цагляная брама ў выглядзе трох markнавялікіх арак. Па баках брамы ўзвышаюцца невялікія пінаклі. Над цэнтральнай аркай размешчаны ступеньчаты атык.

З 1991 г. касцёл аднавіў сваю ранейшую функцыю храма. Служба праводзіцца толькі ў адрэстаўраванай частцы, у адным з бакавых нэфаў. Асноўная частка касцёла закрыта для наведвання.

У ландшафе горада займае значнае месца, з'яўляецца адной з яго асноўных архітэктурных дамінант і аб'ектаў, які актыўна наведваецца турыстамі і гасцямі горада.

*7.1.2 Кароткая гістарычная даведка са старажытнасці і па сёння.*

Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці з'яўляецца адным са старажытных помнікаў горада. Пабудаваны ў 1614 ці 1617 г. спачатку як драўляны будынак, а ў 1637 г. як каменны. Значная перабудова касцёла адбылася ў 1746–1750 гг. архітэктарам Я. Глаўбіцам у стылі так званага «віленскага» барока. Інтэр'ер будынку быў упрыгожаны ляпнымі алтарамі і фрэскамі ў стылі позняга барока. Фрэскі размешчаны на сценах галоўнага і часткі бакавых нэфаў. Захавалася каля 20 фрэскавых кампазіцый, з якіх найбольшую каштоўнасць маюць партрэты заснавальнікаў касцёла і батальныя сюжэты вайны з Маскоўскім царствам 1654-1667гг. На адной з фрэсак цэнтральнага нэфа вылучаюцца дзве фрэскі, якія распавядаюць аб трагічнай гісторыі горада. Гэта фрэскі «Узяцце Мсціслава маскоўскімі войскамі» і «Забойства ксяндзоў». Вялікую цікавасць уяўляюць выявы музыкантаў, такія як «Габаіст і віялэнчыяліст» Выявы гэтых музыкантаў раней дапаўняў арган, які зараз страчаны.

Апошняя служба ў касцёле адбылася ў 1938 г. У савецкі перыяд у будынку касцёла знаходзілася сховішча гародніны. З 1974 па 1996 гг. у касцёле перыядычна праводзіліся даследчыя, кансервацыйныя і рэстаўрацыйныя работы як самаго будынку, так і насценнага жывапісу. У 1991 г. касцёл аднавіў сваю дзейнасць як каталіцкі храм. Аднак, служба праводзіцца толькі ў адрэстаўраванай частцы, у капліцы, якая размешчана ў адным з бакавых нэфаў. Асноўная частка касцёла закрыта для наведвання.

### 7.2 **Значэнне**

Кармеліцкі касцёл Успення Божай Маці з'яўляецца асноўнай архітэктурнай дамінантай г. Мсціслава.
Ён размешчаны на адным з высокіх схілаў, каля Замкавай гары, і добра праглядаецца з усіх бакоў.

З'яўляецца помнікам міжнароднага значэння, выдатны твор познебарочнай архітэктуры Усходняй Еўропы. Разам з тым, ён мае вялікае значэнне для гісторыі і культуры Мсціслава, адзін са значных фактараў фарміравання мясцовай ідэнтычнасці.

З улікам сваёй мастацкай, гістарычнай і культурнай вартасці Кармяліцкі касцёл з'яўляецца найбольш перспектыўным для турыстычнага наведвання.

Акрамя таго, гэта яшчэ і сакральны аб'ект, месца набажэнства для каталіцкай абшчыны горада.

## 7.3 **Уразлівасць/ацэнка рызыкі**

Кансервацыйныя і рэстаўрацыйныя работы, якія праводзіліся на помніку ў 1980-я гг.і 1990-я гг, дазволілі правесці аварыйныя работы на касцёле, змяніць перакрыцці, парамантаваць дах, замацаваць сцены, правесці кансервацыю і чатковую рэстаўрацыю насценнага жывапісу. Была поўнасцю адрэстаўравана капліца ў бакавым нэфе, дзе зараз праводзяцца касцёльныя службы.

Разам з тым, на сённяшні дзень існуе вялікая рызыка страты нават тых намаганняў па кансервацыі і рэстаўрацыі, якія былі зроблены, паколькі вось ужо больш за 25 гадоў на аб’екце не праводзіліся адпаведныя работы з-за недахопу фінансавых сродкаў.

Асноўныя патэнцыйныя рызыкі для фізічнага стану або кіравання аб’ектам:

| **Патэнцыйная рызыка** | **Рэзервовы план** |
|---|---|
| Неабгрунтаваныя інтэрвенцыі, якія прыносяць шкоду аўтэнтычнасці помніка | Вядзенне работ прафесіяналамі, забеспячэнне адпаведнага кантролю з боку адпаведных органаў |
| Выкарыстанне танных матэрыялаў і неадэкватных тэхналогій | Забяспечыць кантроль над матэрыяламі і тэхналогіямі, якія выкарыстоўваюцца. |
| Недахоп ведаў, навыкаў кансервацыі і рэстаўрацыі, асабліва насценага жывапісу | Выкарыстанне толькі вопытных спецыялістаў у галіне кансервацыі і рэстаўрацыі, прыцягненне міжнароднага вопыту, правядзенне трэнінгаў для рэстаўратараў |
| Ігнараванне сучасных, міжнародна прызнаных стандартаў і практык у галіне рэстаўрацыі | Распрацоўка і ўкараненне метадалогіі аднаўлення ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі |
| Палітычны ціск - нестабільнасць і разыходжанне паміж структурамі прыняцця рашэнняў | Каардынацыя паміж рознымі ўзроўнямі кіравання; садзейнічанне дэпалітызацыі працэсу аднаўлення |
| Фінансавыя праблемы, немагчымасць забяспечыць якасць кансервацыі і рэстаўрацыі | Прыцягненне бюджэтных сродкаў, разгляд альтэрнатыўных сцэнарыяў і выяўленне патэнцыяльных спонсараў |
| Пост-рэстаўрацыйны менеджмент | Прыцягненне адпаведных экспертаў<br>Стварэнне інавацыйных партнёрскіх адносін з іншымі ўстановамі і арганізацыямі; |
| Небяспечныя прыродныя з'явы (ваганні тэмпературы, вільготнасць і г.д.) | Паскорыць рэалізацыю праекта |

## 7.4 **Тэхнічныя ўмовы**

Сам будынак Кармяліцкага касцёлу знаходзіцца ў здавальняючым стане. У 1990-я гг. былі ўмацаваныя перакрыцці касцёла, сцены, адноўлена вонкавая тынкоўка, адноўлена ляпніна і архітэктурныя дэталі інтэр’еру. Была праведзена кансервацыя (умацаваннне слою фарбы і інш) і частковая рэстаўрацыя насценнага жывапісу. Аднак, у агульнай масе было выканана каля 30 %

работ. З-за адсутнасці фінансавання ёсць рызыка разбурэння нават тых вартасцей, якія былі дасягнутыя ў працэсе папярэдняй рэстаўрацыі.  Так, напрыклад, да рэспубліканскага фестывалю “Дажынкі” у 2016 г.  фасады касцёла паверх тынку былі пафарбаваныя акрылавай фарбай, без узгаднення з рэстаўратарамі, што ў выніку прывяло да пашкоджання тынку. Праблема яшчэ ў тым, што акрылавыя фарбы вельмі складана зняць без далейшага нанясення шкоды аб’екту.

Тэрыторыя касцёла не добраўпарадкавана: адсутнічаюць камфортныя пешаходныя сувязі з прылеглымі тэрыторыямі, пляцоўкі адпачынку на тэрыторыі і азеляненне, адвод паверхневых вод з тэрыторыі неарганізаваны, агароджа тэрыторыі патрабуе рамонтна-аднаўленчых работ, адсутнічае вонкавае асвятленне. Аднак арганізавана аўтамабільная паркоўка .

## 7.5 **Кароткі выклад неабходных рамонтных работ**

Будынку Кармяліцкага касцёлу  неабходныя наступныя рамонтныя і рэстаўрацыйныя  работы:
1. Правесці дадатковыя даследаванні сучаснага фізічнага стану аб'екта і жывапісу (фрэсак).
2. Правесці хіміка-фізічныя і геалагічныя даследаванні на аб'екце.
3. Правесці інжынерныя даследаванні нясучых канструкцый будынка.
4. Рамонт даху.
5. Рамонт адноўленых у 1990-я гг.  скляпенняў
6. Супрацьаварыйнае ўмацаванне элементаў сцен і скляпенняў
7. Рэстаўрацыя  падлогі;
8. Рэстаўрацыя вокнаў, дзвярэй (існуючай сталяркі)
9. Правядзенне інжынерных сетак
10. Рэстаўрацыя алтарнай часткі.
11. Рамонт і асвятленне вежаў
12. Кансервацыя і рэстаўрацыя жывапісу
13. Узнаўленне гістарычнага пакрыцця фасадаў  на падставе хіміка-фізічных даследаванняў.
14. Добраўпарадкаванне тэрыторыі с узнаўленнем страчаных элементаў.

## 7.6 **Палітыка кансервацыі/прапановы па ўзнаўленню**

### *7.6.1 Разгорнутае рэзюмэ бачання аб'екта спадчыны, а таксама яго ўстойлівасць, на гэтым папярэднім этапе.*

Праект прадугледжвае поўную рэабілітацыю Кармяліцага касцёла ў Мсціславе, кансервацыю і рэстаўрацыю будынку, інтэр’ераў, насценнага роспісу, а таксама добраўпарадкаванне акаляючай тэрыторыі.

Прыставанне будунку касцёла застаецца нязменным. Ён будзе па-ранейшаму выконваць сакральную функцыю, як прыхадскі касцёл для каталіцкай абшчыны Мсціслава.

З цягам часу плануецца закупіць новы арган для храма, каб аднавіць у тым ліку і ўласцівы для гэтага храму спрадвеку “голас”. Адноўленыя інтэр’еры, роспісы, музычны фон створаць атмасферу духоўнасці і высокай эстэтыкі. Допраўпарадкаваная  тэрыторыя, акрамя выканання функцыянальных задач, будзе адпавядаць духу месца і самаго будынку.

З улікам значэння аб’екта спадчыны не толькі як сакральнага (духоўнага ) цэнтра для мясцовай супольнасці, але і як сімвала, што адлюстроўвае шматвякавую гісторыю горада Мсціслава, касцёл Кармялітаў з цягам часу стане месцам паломніцтва для пілігрымаў і шматлікіх турыстаў.

*Аднак, рэабілітацыя касцёла можа праходзіць па некалькіх сцэнарыях.*

**Першы сцэнарый**: ***інтэрвенцыі нязначныя, задача – прыстасаваць аб'ект для агляду, без прыцягнення значных сродкаў.***

З улікам гэтага неабходна зрабіць:
1) Правесці дадатковыя даследаванні на аб'екце (сучаснага фізічнага стану аб'екта і насценнага жывапісу; інжынерныя даследаванні нясучых канструкцый будынку);
2) Рамонт аднoўленых у 1990-я гг. скляпенняў і даху;
3) Правесці комплекс работ па супрацьаварыйнаму ўмацаванню сцен і скляпенняў;
4) Правесці работы па рэстаўрацыі падлогі;
5) Адрэстаўраваць вокны, дзверы; існуючую сталярку;
6) Узнавіць гістарычнае пакрыццё фасадаў.
7) У асноўным аб'ёме касцёла паставіць "інвентарныя лясы" для каменных работ.
8) Правесці часовыя інжынерныя сеткі, часовае акустычнае абсталяванне і інфрачырвонае ацяпленне;
9) Стварыць і размясціць часовую экспазіцыю насценнага жывапісу касцёла з дапамогай аптычных прыбораў.

**Другі сцэнарый: *поўная рэабілітацыя аб'екта***
1. Рэстаўрацыя алтарнай часткі
2. Рамонт і асвятленне вежаў
3. Кансервацыя і рэстаўрацыя жывапісу
4. Правядзенне інжынерных сетак
5. Добраўпарадкаванне тэрыторыі з аднаўленнем страчаных элементаў
6. Увядзенне ў культурны і турыстычны ўжытак

### *7.6.2 Філасофія кансервацыі*

Будынак Кармяліцкага касцёла з'яўляецца помнікам архітэктуры міжнароднага значэння з пункту гледжання яго гістарычнай, культурнай і мастацкай вартасцяў. Ён патрабуе належнага захавання і правядзення кансервацыйных і рэстаўрацыйных работ на высокім прафесійным узроўні з улікам існуючых міжнародных правілаў і стандартаў, і на падставе патрабаванняў нацыянальнага заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Вялікае значэнне мае прымяненне адпаведных матэрыялаў і тэхнік, якія не прывядуць да страты аўтэнтычнасці помніка і яго цэласнасці.

Мае значэнне таксама дызайн ўнутранай і знешняй навігацыі для помніка, добраўпарадкаванне яго тэрыторыі і акаляючага ландшафта.

Добраўпарадкаванне ландшафта тэрыторыі касцёла ў межах агароджы будзе выканана з улікам яе функцыянальных і тапаграфічных характарыстык.

### *7.6.3 Узровень інтэрвенцыі*

Найперш неабходна правесці актуалізацыю праектнай дакументацыі і яе экспертызу.
Набходна даследаваць узровень пашкоджанняў і аб'ем рэстаўрацыйных работ на аб'екце.
Неабходна правесці кансервацыю існуючых архітэктурных дэталей і аднаўленне страт.Замацаваць тынк і фарбавыя пласты жывапісу. Правесці кансервацыю і рэстаўрацыю
жывапісу. Павінны быць мінімальныя ўмяшальніцтвы пры ажыццяўленні аздаблення інтэр'еру і праядзення камунікацый, інжынерных сетак.
Прадугледзець работы па добраўпарадкаванню тэрыторыі касцёла, а менавіта: забяспечыць зручныя пешаходныя сувязі з прылеглымі тэрыторыямі, вонкавае асвятленне, прадугледзець

пляцоўкі для адпачынку, азяляненне тэрыторыі, рамонт існуючых камунікацый і ліўнёвую каналізацыю.
Узровень інтэрвенцыі розны, у залежнасці ад сцэнарыяў, гл. П. 7.6.1.

### *7.6.4 Папярэднія прапановы па функцыянальнаму прымяненню у залежнасці аб абставін*

Выкарыстанне будынку касцёла застаецца ранейшым, ён захоўвае сакральную функцыю і выкарыстоўваецца як каталіцкі храм. Аднак, магчымыя і пажаданыя турыстычныя наведванні аб'екта і нават правядзенне канцэртаў арганнай музыкі ў часы, калі не адбываецца касцёльная служба.

### *7.6.5 Магчымасці для сацыяльнага ўжывання і устойлівга развіцця*

Пазначана ў пункце 7.6.4.

### *7.6.6 Шырокая адзнака прыярытэтаў для кансалідацыі сіл: пакрыццё даху, рамонт, кансервацыя, рэстаўрацыя, рэабілітацыя*

Пазначана ў пункце 7.6.1.

### *7.6.7 Доступ грамадскасці*

Будынак застанецца агульнадаступным і адкрытым для наведвання для ўсіх жадаючых, з пэўнымі абмежаваннямі толькі падчас правядзення адпаведных храмавых дзеянняў.

### *7.6.8 Іншыя перавагі*

Дзякуючы сваёй унікальнасці і выгаднаму размяшчэнню ў цэнтры горада, касцёл Карmеліітаў з цягам часу стане адной з адметных цэнтраў прыцягнення не толькі для каталіцкай абшчыны, але і для іншых гаражан і турыстаў, будзе садзейнічаць фармаванню мясцовага ідэнтытэту, росту папулярнасці горада, спыяць яго ўстойліваму іміджу як сучаснага культурнага цэнтра з яркай і цікавай гісторыяй і культурай.

## 7.7 **Фінансаванне**

### *7.7.1 Шырокая адзнака бюджэтных неабходнасцей і фазы*

Папярэдняя ацэнка кошту праектна-даследчых і рэстаўрацыйных работ праведзена згодна аналагічных аб'ектаў у Беларусі і носіць арыентыровачны характар. Канчатковы кошт работ на аб'екце будзе вызначана пасля распрацоўкі зыходнай праектна-каштарыснай дакументацыі на рэстаўрацыю.

| **Мерапрыемствы** | **Прыкладны кошт** |
|---|---|
| 1. Правядзенне дадатковых даследванняў стану аб'екта (геалагічных, тапаграфічных, фізічнага стану, хіміка-тэхналагічных, інжынерных) | 100 000 еўра |

| | | |
|---|---|---|
| 2. | Разработка праектнай дакументацыі | 300 000 еўра |
| 3. | Рамонт даху і адноўленых у 1990-я гг. скляпенняў | 100 000 еўра |
| 4. | Супрацьаварыйнае ўмацаванне элементаў сцен і скляпенняў | 100 000 еўра |
| 5. | Рэстаўрацыя асноўнага аб'ёма помніка (рэстаўрацыя падлогі, вокнаў, дзвярэй (існуючай сталяркі), правядзенне інжынерных сетак, рэстаўрацыя алтарнай часткі. рамонт і асвятленне вежаў кансервацыя і рэстаўрацыя жывапісу, узнаўленне гістарычнага пакрыцця фасадаў на падставе хіміка-фізічных даследаванняў і г.д.) | 5 000 000 еўра |
| 6. | Добраўпарадкаванне тэрыторыі з узнаўленнем страчаных элементаў. | 400 000 еўра |
| Агульны кошт | | 6 000 000 еўра |

### *7.7.2 Ацэнка рэальных магчымасцей для інвестыцый*

У мэтах прыцягнення інвестыцый для рэстаўрацыйных работ, наступныя органы фінансавання могуць быць разгледжаны:
- Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;
- Міжнародныя і трансгранічныя фонды супрацоўніцтва;
- Мясцовыя сродкі г. Мсціслава і абласны бюджэт Магілёўскай вобласці
- Інвестыцыі з боку каталіцкай царквы і Ватыкана

### *7.7.3 Ацэнка рэальных магчымасцей для інвестыцый*

- Даходы ад турызму
- Сувеніры, публікацыі
- За паслугі ў храме
- Ахвяраванні, спонсарская дапамога

### *7.7.4 Вы ўжо спрабавалі знайсці сродкі для гэтага помніка? Калі так, то якім чынам?*

Так, яны планаваліся ў рамках Дзяржаўнай праграмы па развіццю гістарычных гарадоў, але не былі вылучаныя.

### *7.7.5 Вы ўжо атрымалі сродкі на рэстаўрацыю гэтага помніка? Калі так, то якім чынам? Калі?*

Не

7.8. **Кіраванне**

Праект рэабілітацыі аб’екта будзе ажыццяўляцца Групай па рэалізацыі праекта (ГРП), адказнай за планаванне, арганізацыю працэсу, маніторынг і папулярызацыю. ГРП складаецца з доўгатэрміновых і кароткатэрміновых экспертаў, якія прыцягваюцца для выканання пэўных задач у рамках праекта. Актыўнасць ГРП будзе ўключаць у сябе канкрэтныя дзеянні, такія як унутраныя сустрэчы, неабходныя для паслядоўнага ажыццяўлення ў адпаведнасці з зададзеным графікам. Некаторыя віды дзейнасці, якія патрабуюць высокай ступені спецыялізацыі, будуць мець канкрэтнага каардынатара, які знаходзіцца пад кантролем.

Кіраванне праектам, маніторынг, ацэнка і візкалізацыя будзе ўключаць у сябе наступныя дзеянні:

- тэхнічнае адміністраванне і каардынацыя ўнутраных сустрэч з прадстаўнікамі парнёраў;
- маніторынг рэалізацыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі спонсараў і бенефіцыяраў;
- папярэднія і канчатковыя ацэнкі, у тым ліку тэхнічная і фінансавая;
- заахвочванне і бачнасць, у тым ліку за кошт публікацый і інфармацыйных бюлетэняў.

Раённы выканаўчы камітэт Мсціалава нясе адказнасць за забеспячэнне ўстойлівасці праекта. Ён будзе планаваць штогадовыя сродкі для абслугоўвання і падтрымкі дзейнасці ўстановы. Для далейшага кіравання можна лічыць, што ўласнік  мог бы каардынаваць дзейнасць установы.

## 8. Documentation / additional images



*Касцёл кармялітаў. Від на касцёл з Замкавай гары*



*Касцёл кармялітаў. Від на паўночны фасад і  2-х павярховую прыбудову з унутранай тэрыторыі*



*Касцёл кармялітаў. Від на касцёл  і ўязную браму з боку вул. Кармяліцкай*



*Касцёл кармялітаў. Від на паўднёвы фасад касцёла і ўязную браму з вул. Кірава*






*Касцёл кармялітаў. Від на ўсходні фасад касцёла з боку аўтамабільнай паркоўкі*



*Касцёл кармялітаў. Від на заходні фасад касцёла*



*Фрэска «Забойства карміліцкіх манахаў («Трубяцкая разня»), здымак1912 г.*



*Фрэска "Штурм Мсціслава маскоўскім войскам князя Трубяцкога ў  1654 г.", здымак 1912 г.*



*Фрагменты інтэр'ера касцёла кармялітаў*

## 9. **Вынікі і рэкамендацыі для распрацоўкі тэхніка-эканамічнага абгрунтавання** ( Feasibility Study)

У выпадку складання тэхніка-эканамічнага абгрунтавання праекта рэстаўрацыі Касцела кармялітаў, наступныя рэкамендацыі павінны быць прыняты пад увагу:

- Вызначэнне структуры кіравання і відаў дзейнасці, якія будуць ажыццяўляцца для рэалізацыі
- Правядзенне дадатковых даследаванняў з улікам часу і аналіз аб'емаў работ і фінансавых затрат;
- Патрэба ў дадатковых кансультацый экспертаў са структурных інжынераў і прафесійных майстроў рэстаўрацыі. Разгляд ўдзелу міжнароднага вопыту.


**ПТА падрыхтаваны:**
Людміла Кірыенка, Дырэктар Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея
E-mail: , irmaultra@yandex.by

У супрацоўніцтве з Наталляй Мурынай, нацыянальным экспертам.
E-mail: nm@csmart.by

Каардынацыя і рэдакцыя дакумента:
Ала Сташкевіч, Супрацоўнік праекта
E-mail: as.belicom@gmail.com